В частности, возможно использование в качестве таковых и несовершеннолетних лиц, достигших возраста уголовной ответственности, которые вследствие отставания в психическом развитии, не связанном с психическим расстройством (заболеванием), во время совершения общественно опасного деяния были не способны сознавать фактический характер или общественную опасность своего деяния и других.

Помимо лица, деянием которого совершается преступление, посредственный исполнитель может использовать еще и средства совершения преступления. Под средством совершения преступления в теории уголовного права понимаются предметы материального мира (орудия, приспособления) при помощи которых было совершено преступление.

**Заключение.** Таким образом, целесообразно сформулировать п. 14 ч. 1 ст. 64 УК в следующей редакции: «14) совершение преступления с использованием заведомо для виновного лиц, не подлежащих в силу закона уголовной ответственности, или средств, а равно лиц, совершивших преступление по неосторожности».

Список литературы

1. Барков, А. В. Соучастие в совершении преступлений по уголовным делам / А. В.Барков // Судебная практика в контексте принципов законности и права: сб. науч. тр. – Минск : Тесей, 2016.
2. Саркисова, Э. А. Уголовное право. Общая часть: учеб. пособие / Э. А. Саркисова. – Минск : Тесей, 2015. – 592 с.
3. Уголовный кодекс Республики Беларусь: принят Палатой представителей 2 июня 1999 г.: одобр. Советом Респ. 24 июня 1999 г.: в ред. от 11 ноября 2019 г. // КонсультантПлюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2020.

# НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ГІСТОРЫКА-ДЭМАГРАФІЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ У БЕЛАРУСІ Ў ПАСЛЯАКУПАЦЫЙНЫ ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (1944–1945 гг.)

*Нікалаева І.У.*
*Віцебск, Віцебскі філіял Міжнароднага універсітэта «МІТСО»*

Асэнсаванне дэмаграфічнай сітуацыі ў Беларусі пасляакупацыйны перыяд Вялікай Айчыннай вайны ўяўляе навуковую цікавасць для ўсебаковага вывучэння грамадскіх трансфармацый пад уплывам ваенных падзей і стварае дадатковыя магчымасці інтэрпрэтацыі праблемы ролі ваенных канфліктаў у гісторыі.

Мэта даследавання – ахарактарызаваць дэмаграфічныя фактары, якія аказалі ўплыў на паўсядзённае жыццё беларускага грамадства пасля вызвалення тэрыторыі БССР ад нацысцкай акупацыі.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне ажыццяўлялася на аснове апублікаванай, а таксама архіўнай інфармацыйнай і справаздачнай дакументацыі, якая асвятляе розныя аспекты сацыяльна-дэмаграфічнай пасляакупацыйнай сітуацыі. Былі выкарыстаны такія метады гістарычнага пазнання, як гісторыка-апісальны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны, статыстычны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Значныя змены ў дэмаграфічным і сацыяльным складзе насельніцтва Беларусі, якія адбыліся за перыяд вайны і акупацыі, галоўным чынам вызначылі дэмаграфічную сітуацыю, якая склалася ў рэспубліцы ў пасляакупацыйны ваенны перыяд. Вялікая Айчынная вайна прывяла не толькі да велізарных людскіх страт, але і рэзкага зніжэння нараджальнасці ў ваенныя гады. Агульны дэмаграфічны крызіс узмацняўся значнай дыспрапорцыяй ў структуры насельніцтва на карысць жанчын.

Па афіцыйных звестках, з 27 млн. людскіх страт СССР у гады Вялікай Айчыннай вайны 76%, або 20 000 тыс. чалавек, прыходзілася на мужчын. Найбольш пацярпела пакаленне мужчын, якія нарадзіліся ў 1901–1931 гг., з агульнай велічыні страт на іх долю прыйшлося 55% або 10 000 тыс. заўчасна перапыненых жыццяў [1, с. 342]. Нягледзячы на існуючыя дыскусіі і разыходжанні ў падліках людскіх страт у гады вайны, што выклікана шэрагам аб’ектыўных і суб’ектыўных прычын, а таксама супярэчлівасцю і недастатковай паўнатой архіўных даных, якія выкарыстоўваюцца, відавочна перавышэнне колькасці жанчын над колькасцю мужчын, асабліва сярод найбольш дзеяздольнай часткі насельніцтва, якое пражывала на вызваленай тэрыторыі СССР.

Вялікія дэмаграфічныя страты ў выніку вайны і акупацыі, перш за ўсё мужчынскага насельніцтва, прывялі да рэзкай дыспрапорцыі палоў і сярод насельніцтва БССР. Да вяртання дэмабілізаваных мужчын гэты палавы дысбаланс быў найбольш адчувальным. Непаўната даных аб нараджальнасці і смяротнасці насельніцтва ва ўмовах акупацыі, велічыні ваенных страт не дазваляе прадставіць у цэлым полаўзроставую структуру насельніцтва рэспублікі ў пасляакупацыйны ваенны перыяд. Аднак наяўныя асобныя статыстычныя звесткі сведчаць аб істотным разрыве паміж мужчынскім і жаночым насельніцтвам, які склаўся за кошт старэйшых узростаў. Так, па даных перапісу ў г. Гродна на 16 жніўня 1944 г., на жанчын прыходзілася 63,5% дарослага насельніцтва [2, с. 403].

Найбольшае парушэнне ў суадносінах палоў на карысць жанчын мела месца ў сельскай мясцовасці, пры тым, што ўдзельная вага вяскоўцаў складала больш за 80% усяго насельніцтва вызваленай рэспублікі. Па даных пагаспадарчых кніг, на 1 студзеня 1945 г. было ўзята на ўлік 5200,8 тыс. сельскіх жыхароў, сярод якіх на 867,7 тыс. мужчын ва ўзросце ад 16 гадоў і

старэй прыходзілася 1891,6 тыс. жанчын ці 68,5%. Пры гэтым у складзе насельніцтва ад 16 да 50 гадоў доля жанчын склала 72,5% [3, с. 344]. Такая была агульная дэмаграфічная сітуацыя. У асобных раёнах яна складалася яшчэ больш неспрыяльна. Так, на 1 студзеня 1944 г. у Гомельскай вобласці мужчын працаздольнага ўзросту (16–54 гады) налічвалася 36 748, жанчын адпаведна 110 879 (75,1%) [4, с. 417]. Паводле статыстычных даных, прадстаўленых раёнамі пасля вызвалення, сярод сельскага насельніцтва Віцебскай вобласці на 1 жніўня 1944 г. жанчыны складалі 68% ад усіх жыхароў. Пры гэтым найбольшая перавага жанчын была ва ўзроставай групе ад 16 да 55 гадоў, яны складалі 80% ад агульнай колькасці тых, хто з'яўляўся асноўнай працаздольнай часткай пасляваеннага грамадства [5, арк. 54]. Нават з улікам мужчынскага насельніцтва ва ўзросце да 60 гадоў, працэнт жанчын па асобных раёнах Віцебскай вобласці складаў ад 70 да 90% усіх вяскоўцаў у дадзенай узроставай групе [6]. Аналагічная карціна назіралася паўсюдна. Пасля заканчэння вайны, калі былыя франтавікі вярнуліся дадому, удзельная вага жанчын некалькі знізілася, аднак палавы дысбаланс, абумоўлены ваеннымі стратамі, захаваўся.

Перавага жаночага насельніцтва сярод дзеяздольнай часткі жыхароў рэспублікі вызначыла іх важную ролю і значэнне ў аднаўленні народнай гаспадаркі ў пасляакупацыйны ваенны перыяд. У выніку, напрыканцы вайны назіралася павелічэнне ўзроўню занятасці жанчын. Адразу пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад акупацыі яны складалі пераважную частку кадраў на прадпрыемствах і сталі асновай працоўных рэсурсаў ў вёсцы (каля 80% працаздольных ва ўзросце 16 гадоў і старэй, якія працавалі на працягу 1944 г. у калгасах рэспублікі прыходзілася на жанчын) [7].

Палавы дысбаланс прывёў не толькі да адмоўных наступстваў ў нараджальнасці насельніцтва (нягледзячы на пэўную кампенсацыю надзвычай нізкай нараджальнасці ў 1942–1944 гг., яе даваенны ўзровень не быў дасягнуты нават пасля заканчэння вайны), але і дэфармаваў структуру шлюбнасці насельніцтва. Надзвачайныя страты мужчынскага насельніцтва пазбавілі многіх жанчын патэнцыйных шлюбных партнёраў, што стала прычынай павелічэння долі адзінокіх жанчын, значна пабольшалася колькасць пазашлюбных нараджэнняў. По існуючых падліках, калі ў 1945 г. ў СССР было 281,7 тыс. адзінокіх маці, то ў 1957 г. ужо 3 312 тыс. [8, с. 168–169]. Значная колькасная перавага жанчын мела сваім следствам істотнае паслабленне трываласці шлюбаў і рост колькасці разводаў па ініцыятыве мужчын.

**Заключэнне.** Такім чынам, за час вайны і акупацыі адбыліся істотныя змены ў дэмаграфічным складзе насельніцтва Беларусі, у тым ліку звязаныя з рэзкай дыспрапорцыяй палоў і перавагай жанчын, асабліва сярод найбольш дзеяздольнай часткі беларускага грамадства. Вызначаная асаблівасць пасляакупацыйнай ваеннай рэчаіснасці аказала ўплыў на фарміраванне далейшага сацыяльна-дэмаграфічнага складу насельніцтва і дэфармавала

шлюбную и сямейную структуры, што пэўным чынам паўплывала на ўклад паўсядзённага жыцця жыхароў рэспублікі.

Спіс літаратуры


1. Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне / А. М. Литвин [и др.]; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2015. – 495 с.
2. Гродненщина накануне и в годы Великой Отечественной войны (1939–1945): по док. гродн. архивов / сост. Г. А. Андросенко [и др.]. – Гродно : Гродн. тип., 2005. – 600 с.
3. Падлічана па: Вклад белорусского народа в Победу… С. 344.
4. Падлічана па: Кузнецова-Тимонова, А. В. Война и мир белорусского крестьянства: осень 1943 – весна 1944 г. / А. В. Кузнецова-Тимонова // Этот день мы приближали, как могли… : материалы Междунар. науч.-практ. конф. (Минск, 7–8 мая 2015 г.). В 2 ч. Ч. 1 / НАН Беларуси, М-во обороны Респ. Беларусь ; редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2016. – С. 417.
5. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 1-п. Воп. 1. Спр. 42.
6. Подлічана па: ДАВВ. – Ф. 1-п. Воп. 1. Спр. 162. Арк. 1–39.
7. ДАВВ. – Ф. 1-п. Воп. 1. Спр. 4. Арк. 24, 27 ; падлічана па: Восстановление сельского хозяйства Беларуси: 1943–1945 : док. и материалы / сост.: В. Д. Селеменев (отв. сост.) [и др.] ; редкол.: В. И. Кураш (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Национальный архив Республики Беларусь, 2018. – С. 236, 238, 241, 243, 246, 248, 251.
8. Харчев, А. Г. Брак и семья в СССР / А. Г. Харчев. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Мысль, 1979. – 367 с.


# НЕЗАКОННЫЙ ОБОРОТ НАРКОТИКОВ В ГЛОБАЛЬНОЙ СЕТИ ИНТЕРНЕТ


*Николаенко Е.С.*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


На сегодняшний день во всём мире остро стоит вопрос о решении проблемы распространения наркотических средств и психотропных веществ бесконтактным способом посредством сети Интернет и с использованием электронных средств связи. Так как отдельный учёт такого рода преступлений не ведётся,и можно наблюдать лишь приблизительные числа,статистические данные не могут полностью и точно отразить масштаб этого противоправного явления.

Актуальность данной проблемы в том, что ежедневно учащаются случаи незаконного оборота наркотиков с использованием сети Интернет и различных мобильных приложений, которые позволяют преступникам в разы увеличить объемы оборота и при этом сохранить свою анонимность.

Цель работы – выявление современных проблем, связанных с незаконным оборотом наркотиков в сети Интернет и способы их решения.

**Материал и методы.** Материалами работы были законодательные акты Республики Беларусь по данной тематике и данные Информационного